На слыху

# Папраівіліся 15 пацыентаў, 54 застаюцца ў бальніцах

## Што мяняецца ў рабоце паліклінік у сувязі з COVID-19

**Пятнаццаць чалавек у Беларусі, у якіх быў выяўлены каранавірус, здаровыя і выпісаны з інфекцыйных стацыянараў, 54 са станоўчымі аналізамі на COVID-19 застаюцца ў бальніцах.**

— У цяперашні час пад медыцынскімназіраннем знаходзяцца 42 пацыенты са станоўчымі лабараторнымі тэстамі, але без клінічных праяў хваробы. Клінічныя прыкметы інфекцыі COVID-19 маюць, гэта значыць з'яўляюцца, па сутнасці, хворымі, 12 пацыентаў, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

Усяго, пачынаючы з канца студзеня, больш за 19 тысяч чалавек абследаваны на інфекцыю COVID-19. За тры тыдні ў краіне зафіксавана 69 выпадкаў новага каранавіруса (нагадаем, што першы выпадак быў выяўлены 27 лютага).

На гэтым тыдні апублікаваны загад Міністэрства аховы здароўя № 296 «Аб мерах па аказанні медыцынскай дапамогі пацыентам з прыкметамі рэспіраторнай інфекцыі і прыняцці дадатковых супрацьэпідэмічных мер у арганізацыях аховы здароўя». Ён рэгламентуе парадак аказання дапамогі пацыентам з COVID-19 і тым, хто з імі кантактаваў. Часова змяняецца і работа паліклінік. У Міністэрстве аховы здароўя расказалі, што мяняецца для іх наведвальнікаў.

### Калі вы захварэлі

Калі вы захварэлі і ў вас павысілася тэмпература, з'явіўся кашаль, задышка, закладзены нос, заставайцеся дома і патэлефануйце ў рэгістратуру, стол даведак ці кол-цэнтр установы аховы здароўя па месцы жыхарства (месцы знаходжання). У размове з супрацоўнікам паведаміце, што вас непакоіць, пакіньце кантакты (імя і прозвішча, адрас, тэлефон). З вамі звяжацца медыцынскі работнік — прытрымлівайцеся яго ўказанняў.

Варта ўлічваць, што ў амбулаторна-паліклінічных установах арганізаваны асобныя ўваходы і кабінеты для прыёму пацыентаў з тэмпературай і сімптомамі вострай рэспіраторнай інфекцыі.

### Калі вы хочаце прайсці флюараграфію ці іншыя абследаванні

Дыспансерызацыю, рэабілітацыю, лабараторныя і інструментальныя абследаванні ў планавым парадку, у тым ліку флюараграфію органаў грудной клеткі, ЭКГ, холтэраўскае манітарыраванне, увядзенне ін'екцыйных лекавых сродкаў праз працэдурны кабінет часова адкладзіце.

### Калі патрэбны рэцэпт

Калі вы маеце патрэбу ў выпісцы рэцэптаў на лекавыя сродкі для пастаяннага прыёму, якія былі раней прызначаны ўрачом, патэлефануйце ў рэгістратуру, стол даведак ці кол-цэнтр установы аховы здароўя па месцы жыхарства, пакіньце кантакты (імя і прозвішча, адрас, тэлефон). З вамі звяжацца медыцынскі работнік, які арганізуе выпіску і дастаўку рэцэптаў на дом.

### Калі вам больш за 60 гадоў

Калі вы старэйшыя за 60 гадоў і маеце патрэбу ў аглядзе медыцынскага работніка ў сувязі з пагаршэннем самаадчування, патэлефануйце ў рэгістратуру, стол даведак ці кол-цэнтр медыцынскай установы па месцы жыхарства, паведаміце пра гэта, пакіньце кантакты (імя і прозвішча, адрас і тэлефон). Цягам дня з вамі звяжацца медыцынскі работнік для ўзгаднення часу для візіту на дом.

Пазбягаючы планавага наведвання медыцынскай установы, вы дазволіце медыкам працаваць больш эфектыўна і дапаможаце абараніць вас і іншых ад магчымага заражэння і распаўсюджвання інфекцыі COVID-19.

### Калі патрэбна выпіска з медыцынскіх дакументаў

Афармленне выпісак з медыцынскіх дакументаў арганізавана па анлайн-заяўках на інтэрнэт-сайтах устаноў з наступнай іх выдачай пацыентам пры прад'яўленні пасведчання асобы, у спецыяльна адведзеным месцы.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ТУРЫСТЫ ВЯРТАЮЦЦА

## У сталіцы ўчора прызямліўся борт з беларускімі грамадзянамі з аэрапорта Унукава

**Чартарным рэйсам авіякампаніі «Белавія» дадому вярнуліся 114 пасажыраў. Рэйс адбываўся па заказе турыстычнай кампаніі «Анекс тур».**



Фота БелТА.

«У краіны, дзе ёсць паветраныя авіязносіны, авіякампанія працягвае лётаць і арганізоўваць рэйсы, каб беларусы маглі вярнуцца ў Мінск. На гэты час «Белавія» арганізавала тры дадатковыя чартарныя рэйсы па маршруце Мінск — Баку, каб грамадзяне Азербайджана маглі вярнуцца ў Баку і, адпаведна, грамадзяне Беларусі маглі прыляцець у Мінск. Таксама сумесна з турыстычнымі аператарамі мы робім усё магчымае для таго, каб па ўзгодненым графіку вярнуць турыстаў з Егіпта дадому», — перадае словы **начальніка аддзела рэкламы і камунікацый «Белавія» Вольгі ГЕРАСЕНКА БелТА.**

Расія пасля закрыцця граніц для беларусаў пакінула магчымасць транзіту праз маскоўскія аэрапорты Шарамецьева і Дамадзедава з умовай, што грамадзяне вылецяць у Беларусь на працягу 24 гадзін. Аднак большасць расійскіх рэйсаў з краін Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна прыбываюць у маскоўскі аэрапорт Унукава, адкуль няма прамых рэйсаў у Мінск.

«Мы адпачывалі ў Тайландзе 12 дзён, усё было выдатна. За два дні да вылету нам сказалі, што нас не пасадзяць на борт самалёта да Масквы. У выніку з вялікімі праблемамі нас даставілі ў Маскву. Ва Унукава мы прыляцелі сёння раніцай, — расказалі БелТА Аксана і Сяргей з Бабруйска. — У нас была праблема паляцець з Тайланда, але калі мы прыляцелі ў Маскву, былі ўпэўнены: наша краіна нас не кіне, і нас даставяць дадому».

Сітуацыю з беларускімі грамадзянамі, якія не могуць вярнуцца ў краіну з-за закрыцця граніц, пастаянна кантралюе Міністэрства замежных спраў Беларусі. Як перадае прэс-служба МЗС, учора кіраўнік ведамства Уладзімір Макей па тэлефоне правёў перагаворы з латвійскім і літоўскім калегамі. Падчас размовы была ўдзелена ўвага ўзаемадзеянню па перамяшчэнні грамадзян праз агульныя граніцы.

Міністр замежных спраў Латвіі Эдгарс Рынкевічс падзякаваў беларускаму боку за магчымасць транзіту латвійскіх грамадзян з трэціх краін праз Нацыянальны аэрапорт Мінск.

Уладзімір Макей выказаў удзячнасць літоўскаму ўраду ў асобе міністра замежных спраў Лінаса Лінкявічуса за аператыўнае вырашэнне праблемных пытанняў, пазначаных беларускім бокам на працягу апошніх дзён. Міністры дамовіліся аб падтрыманні пастаяннага кантакту для ўрэгулявання праблем, якія ўзнікаюць у сувязі з крызіснай сітуацыяй.

«Па звестках Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь, толькі за апошнія трое сутак за мяжу выехала каля 11 тысяч грамадзян нашай краіны. Падкрэсліваем, што гэтыя выезды ажыццяўляюцца пасля дакладных рэкамендацый МЗС устрымацца ад замежных паездак», — заявіў **прэс-сакратар МЗС Анатоль ГЛАЗ.**

Дыпламаты яшчэ раз настойліва раяць адмяніць паездкі без пільнай неабходнасці за мяжу ў гэты перыяд. Ведамства падкрэслівае, што грамадзяне, якія ажыццяўляюць падобныя крокі, павінны разумець, што робяць гэта на свой страх і рызыку.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# РЭПЕТЫЦЫЙНАЕ ТЭСЦІРАВАННЕ ПАДОЎЖАЦЬ ДА КАНЦА МАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пад правядзенне РТ не будуць задзейнічаць паточныя аўдыторыі з вялікай колькасцю пасадачных месцаў. У аўдыторыях будзе выкарыстоўвацца прынцып мінімізацыі рызык распаўсюджвання рэспіраторных інфекцый: абітурыентаў пасадзяць не менш чым за метр адно ад аднаго, памяшканне будзе праветрывацца.

Меркавалася, што рэпетыцыйнае тэсціраванне скончыцца ў канцы красавіка, але Міністэрства адукацыі рэкамендавала падоўжыць гэты этап да 24 мая.

**Яшчэ раней ВНУ было рэкамендавана адмовіцца ад лекцый, каб пазбегнуць масавага збору людзей, і выкарыстоўваць іншыя формы заняткаў.**

**Прарэктар па выхаваўчай рабоце БДУІР Дзмітрый КУЗНЯЦОЎ** паведаміў, што для большасці студэнтаў іх універсітэта пачатак вучэбных заняткаў быў перанесены на 9.45. Асобныя вучэбныя заняткі пераведзены на кіраваную работу студэнтаў у плане засваення тэарэтычнага матэрыялу. Для дадатковага кансультавання студэнтаў арганізавана ўзаемадзеянне з выкладчыкамі ўніверсітэта з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

У БНТУ таксама плануюць скарэкціраваць расклад вучэбных заняткаў з пачатку наступнага тыдня: прапрацоўваюцца розныя варыянты арганізацыі навучальнага працэсу з улікам ранішняга часу пік, калі большая частка мінчан дабіраецца на работу на грамадскім транспарце.

Акадэмія кіравання перавяла ў дыстанцыйны рэжым вялікія паточныя лекцыі і іншыя падобныя заняткі, каб пазбегнуць вялікіх мас людзей. «Мы прыкладаем усе намаганні, каб гэта ніяк не адбілася на якасці навучання. Да выкладчыкаў прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні з нагоды кантролю. Студэнты даюць справаздачу па адпрацоўцы кожнага элемента курса, — паведаміў **першы прарэктар Валерый БАРАДЗЕНЯ** карэспандэнту БелТА. — У акадэміі разлічваюць, што гэта ў нейкай меры матывуе маладых людзей займацца больш старанна. Кожны дыстанцыйны курс суправаджаецца формамі кантролю. Студэнтам трэба не толькі прачытаць лекцыю, але і адказаць на кантрольныя пытанні, здаць невялікі тэст».

Ва ўсіх ВНУ абмежавалі навуковыя і культурна-масавыя мерапрыемствы або праводзяць іх у анлайн-рэжыме.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Саюз моладзі арганізаваў работу гарачых ліній

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі з сённяшняга дня арганізуе ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі работу гарачых тэлефонных ліній для аказання інфармацыйнай дапамогі пажылым людзям, паведаміў другі сакратар Цэнтральнага камітэта Саюза моладзі Алег ДЗІКУН.**

Паводле яго слоў, гарачыя тэлефонныя лініі ствараюцца пры кожным тэрытарыяльным камітэце БРСМ з мэтай аказання інфармацыйнай дапамогі адзінокім людзям ва ўзросце ад 65+. «На першым этапе работы гарачых ліній нашы валанцёры змогуць падказаць бабулям і дзядулям тэлефоны тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, гігіены і эпідэміялогіі, найбліжэйшых устаноў аховы здароўя. Калі лінія выкліканага абанента будзе доўга занятая, нашы валанцёры дапамогуць аператыўна атрымаць зваротную сувязь, — расказаў Алег Дзікун. — Гарачыя лініі пачалі работу з учарашняга дня».

Акрамя таго, па жаданні пажылых людзей актывісты Саюза моладзі дапамогуць ім праз інтэрнэт замовіць тавары першай неабходнасці. **Маладзёжныя гарачыя лініі будуць працаваць штодзённа з панядзелка да суботы ўключна з 9.00 да 18.00. Тэлефоны абласных гарачых ліній: у Брэсце — 8 (0162) 21 15 91, Віцебску — 8 (0212) 66 20 87, Гомелі — 8 (0232) 56 33 15, Гродне — 8 (0152) 71 98 33, Магілёве — 8 (0222) 76 67 82. Тэлефоны гарачых ліній у буйных гарадах Мінскай вобласці: у Салігорску — 8 (0174) 20 03 45, Слуцку — 8 (01795) 7 50 80, Маладзечне — 8 (0177) 74 95 01. У Мінску тэлефон гарачай лініі 8 (017) 284 85 54.**

Алег Дзікун таксама дадаў, што днямі Саюз моладзі запусціў у сацыяльных сетках чэлендж *#спасибомедикам* у знак падзякі людзям, якія кожны дзень заступаюць на медыцынскі пост і дзякуючы якім эпідэміялагічная сітуацыя ў Беларусі знаходзіцца пад кантролем. «Бо менавіта медыцынскія работнікі кожны дзень прымаюць выклікі на дом, вядуць прыёмы, наведваюць і лечаць хворых, даюць тлумачэнні і кансультуюць па прафілактыцы каранавіруснай інфекцыі, прызначаюць лячэнне і проста знаходзяцца побач. І пакуль некаторыя нагнятаюць паніку, гэтыя людзі робяць сёння ўсё магчымае, каб жыхары Беларусі былі здаровыя», — падкрэсліў ён.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**